соответствуют гигиеническим требованиям.

По результатам регистрационных испытаний препараты БАКЛЕР, КМЭ и РАЙОК, КЭ допущены в Государственный реестр средств защиты растений и удобрений, разрешенных к применению на территории Республики Беларусь как средства против мучнистой росы и пятнистостей листьев на лиственных породах вносимые с использованием БЛА.

В рамках представленной работы, с целью облегчения процесса применения агродронов для защиты растений, повышения его точности и эффективности, снижения экологических и социальных рисков при использовании пестицидов, разработана методика использования БЛА для защиты лесных питомников в качестве пособия для специалистов лесного хозяйства.

УДК 338.48:502

Н.И. Зданович, ст. преп.
(БДТУ, г. Мінск)

## МАГЧЫМАСЦІ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ АБ'ЕКТА СПАДЧЫНЫ Ў ЭКСКУРСІЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ: ГІСТАРЫЧНЫЯ ЭПОХІ І ЛЁСЫ ЛЮДЗЕЙ ПРАЗ ПРЫЗМУ АРХІТЭКТУРНАГА ЗБУДАВАННЯ

Архітэктурныя збудаванні – гэта летапісы часу і лёсаў людзей. Яны маюць не толькі інфармацыйнае, але і выхаваўчае значэнне. Задача экскурсавода – прымусіць "загаварыць" аб'ект. Прасочым гэта на прыкладзе аднаго з аб'ектаў на тэрыторыі былой сядзібы Кухцічы (цяпер пасёлак Першамайскі), размешчанай недалёка ад г. Узда.

Гэта былы Кальвінскі збор, пабудаваны ў 1560-1570-я гады на гроша тагачаснага ўладальніка в. Кухцічы Мацея Кавячынскага, вядомага кальвініста, паплечніка гуманіста і асветніка Сымона Буднага. З братамі Кавячынскімі звязана згадка пра пачаткі кнігадрукавання на тэрыторыі Беларусі: яны дапамагалі Сымону Буднаму ў 1570-х гадах выдаць яго «Біблію», дзякуючы чаму ў яе прадмове з'явіліся радкі «Пісана ва Уздзе, року ад нараджэння Сына Божага 1572» [1; 2, с. 159].

Першапачаткова храм ўяўляў сабою пабудову шасціграннай формы, і, па традыцыі пратэстанцкіх храмаў, не меў алтарнага выступу – апсіды. Як час узвядзення храма, так і яго планіроўка – падстава для расповяду пра рэфармацыйны рух у Заходняй Еўропе і

ў ВКЛ і пра сутнасць кальвінізму як веравызнання, пра адметнасці формы пратэс-тантскіх храмаў 16-17 стст.

Храм збудаваны ў сярэдзіне XVI ст. па тыпе сярэднявечных кальвінскіх збораў і мае выгляд абарончага храма: таўшчыня сцен дасягае 1,5 м, аб'ём 12-граннай зальнай часткі ствараe ўражанне невялікай крэпасці [2, с. 158]. Аналагічныя рысы меў яго прататып, амаль блізнец – кальвінскі збор у Смаргоні. Стылістычныя адметнасці пабудовы – повад сфармаваць у экскурсантаў уяўленне пра стыль Рэнесанс: гэта геаметрызм форм у аснове планiроўкі (у дадзеным выпадку – шматграннік асноўнага аб'ёма, цыліндры - вежы, конусападобнасць даху), круглая форма вокнаў, амаль поўная адсутнасць дэкору. Асноўныя інструменты архітэктара эпохі Рэнесансу – цыркуль і лінейка.

Ужо напрыканцы 16 ст. наступны ўладар Кухцічаў – Крыштаф Кавячынскі – наказаў асвяціць храм як каталіцкі касцёл. Прычына гэтай перамены – повад нагадаць экскурсантам пра складаную рэлігійную сітуацыю ў ВКЛ і Еўропе ў цэлым напрыканцы 16–пачатку 17 ст., растлумачыць тэрмін “контррэфармацыя”, яе прычыны і ўплыў на лёсы не толькі храмаў, але і ўладароў гарадоў і мястэчак.

Новы статус запатрабаваў перабудовы храма: суворы пратэстанцкі выгляд быў зменены: ззаду храма з'явілася апсіда, а галоўны фасад набыў прытвор з вежамі па два бакі ад увахода, з лесвіцамі на другі ярус, а ў дэкоры былі дадзены ляпныя гірлянды і пілястры.

У 1690 годзе Кухцічы адышлі Апалоніі Завішы (шляхетны род герба Лебедзь) [2, с.155]. У канцы 18 ст. касцёл быў прыстасаваны пад капліцу-пахавальню і зноў рэканструяваны. Магчыма, зроблена гэта было італьянскім архітэктарам Карлам Спампані, па праектах якога на Беларусі былі збудаваны шэраг сядзібаў (прыкладам, сядзіба Хмараў у Сёмкаве, палац у Радзівілімонтах і інш.).

У Кухціцкім храме пад алтарнай часткай быў створаны склеп-пахавальня. Да нашага часу ўнутры захаваліся характэрныя для класіцызма гзымсы -“сухарыкі”, а над уваходам быў размешчаны ляпны геральдычны картуш. Хаця інтэр'еры храма не захаваліся, тут да месца будзе распавесці пра розніцу аздаблення пратэстантскіх бажніц, касцёлаў, уніяцкіх і праваслаўных цэркваў.

Магчыма, упрыгожаннем храма ў стылі класіцызм займаўся вядомы скульптар Караль Ельскі. Гэта цалкам верагодна, бо два гэтых знакамітых мастака неаднойчы працавалі разам над аздабленнем інтэр'ераў каталіцкіх бажніц (прыклад – касцёл Нараджэння Дзевы Марыі ў Заслаўі).

Карла Спампані быў запрошаны ў Кухцічы Казімірам Завішам, камергерам караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, генералам каралеўскага войска, не толькі для абнаўлення аблічча касцёла, перарobленага пад магільны склеп, але для пабудовы родавой сядзібы з палацам, якая да нашага часу часткова захавалася ў Кухцічах [3, с. 204–205].

Такім чынам, вядома, што першапачатковы кальвінскі збор двойчы перабудоўваўся і мяняў функцыю: у канцы 16 ст., пры Кавячынскіх, і ў канцы 18 ст., пры Завішах. Але што і калі дабудоўвалася і мянялася – спрэчнае пытанне, таму што абодва архітэктурных стыля (рэнесанс і класіцызм) мелі вытокам антычнасць, а значыць вельмі блізкія рысы ў абліччы.

На дапамогу архітэктарам, якія бяруцца за рэстаўрацыю старажытных архітэктурнях помнікаў, заўсёды прыходзіць архітэктурная археалогія. Кухціцкі храм – повад патлумачыць сутнасць гэтай галіны археалогіі. Археалагічныя шурфы распрацоўваюцца ў праблемных месцах, каб адказаць на пытанне – калі ўзведзены часткі пабудовы, і адначасова ці не. Раскопкі А.М. Кушнярэвіча паказалі, што “сцены пабудаваны ў тэхніцы раўнаслойнай муроўкі з цэглы (27-27,5 х 13-13,5 х 6,5-7см) на вапнава-пясчанай рошчыне... Вежы ўзведзены ў тэхніцы тычковай муроўкі з цэглы (?х13-15 х 6,5-7см).

Рошчына па складу блізкая да ўжытай ў сценах храма…Паміж падмуркамі вежаў і прытвора перавязка адсутнічае. Яна таксама не прасочваецца і паміж іх сценамі” [4, с.115]. Апошняе пацвердзілі так званыя “архітэктурныя зандажы”. Тэрмін таксама трэба патлумачыць экскурсантам (калі тынкоўка збіваецца да цаглянай муроўкі). Зандажы дазваляюць параўнаць не толькі сістэму муроўкі праблемных частак будынкаў (на стыку планіровачных частак, ля воконных ці дзвярных праёмаў), канстатаваць наяўнасць “перавязкі” паміж часткамі будынка, але і вызначыць параметры цаглін, з якой яны складзены (яны маюць храналагічныя адметнасці).

Усё гэта дазволліла даследчыку сцвярджаць, што вежы прыбудавалі ў хуткім часе пасля ўзведзення асноўнага аб'ёма храма, а гэта значыць не ў канцы 18, а ў другой палове 16 ст., і будынак служыў касцёлам і Кавячынскім, і Завішам.

Адзін з Завішаў, Ян Казімір, які памёр у 1887 г., быў вучоным-гісторыкам і археолагам. Даследаваў Кухцічы і наваколлі, раён возера Свіцязь (з патрыятычных пачуццяў, бо гэтыя мясціны – радзіма Адама Міцкевіча). У выніку ў 1871 годзе ім было зроблена адкрыццё

аднаго са старажытных паселішчаў каменнага веку на тэрыторыі Беларусі менавіта пад Навагрудкам [2, с.155].

У сям'і Яна Казімір Завішы шанавалі не дыяменты і золата, а веды і добрыя адносіны да людзей. Традыцыі сям'і пераняла яго дачка – Марыя-Магдаліна. Для яе Кухцічы засталіся самым каштоўным месцам на зямлі да апошніх дзён няпростага жыцця, а гэты храм – самым сакральным месцам на ёй. Пра гэта пераконвае мемарыяльная табліца на дзвярах храма. Тут, у крыпце, у 1914 г. быў пахаваны Мікалай Вацлаў Радзівілл, другі муж Марыі-Магдаліны, які загінуў на фронце Першай сусветнай вайны [5]. Яна паўторна стала ўдавой. Некалі князь Мікалай, герой руска-японскай вайны, заваяваў яе сэрца, таму што быў яе аднадумцам. Яны пабраліся ў Лондане ў 1906 г., хоць нявеста была старэйшая на 19 гадоў.

Прыроджаны ліцвін, Мікалай Вацлаў Радзівілл праяўляе цікавасць да беларускага фальклору, народных традыцый і жыцця сялян. Тут інтарэсы Магдалены і Мікалая Вацлава цесна перасякаліся. Самыя ўплывовыя варшаўскія арыстакратычныя клубы зачынілі для іх усе дзверы.

Але маладыя без ваганняў расталіся з вышэйшым светам, вырашыўшы адправіцца ў Беларусь. Лёс адпусціў ім толькі 7 гадоў сумеснага жыцця. Яна працягвала займацца мецэнацтвам і пасля смерці мужа: адкрывала беларускія школы ў сваіх уладаннях, падтрымлівала беларускую літаратуру ў часы "нашаніўства" (у прыватнасці, падтрымлівала грашыма выдавецтва "Загляне сонца ў наша ваконца"), (Марцін Кухта – Кухцічы) падтрымала ўтварэнне Беларускай народнай Рэспублікі ў 1918 годзе [6]. Потым пачынаюцца гады эміграцыі (Варшава, Лондан, Швейцарыя). Пакуль былі сродкі, аказвала дапамогу беларускім абшчынам на Захадзе.

Магдалена вырашыла пахаваць Мікалая Вацлава ў родных Кухцічах, у сямейным склепе, не ведаючы, які лёс напаткае сядзібу і сам храм. Да 1968 г., амаль 30 гадоў, ён выкарыстоўваўся пад электрастанцыю. Разрабаваныя парэшткі пахавання закаталі ў бетон.

Пасля таго, як электрастанцыя перастала працаваць, будынак быў кінуты. У 80-я гады яго часткова падрамантавалі (накрылі дахам).

Але лес ізноў "злучыў" суджэнцаў амаль праз 104 гады. Магдалена так марыла аб вяртанні на Радзіму, але пры жыцці ёй гэтага не ўдалося. Яна памерла 6 студзеня 1945 года ў кляштары дамініканак і была пахавана ў горадзе Фрыбургу, у Швейцарыі. Аб жаданні сваякоў перавезці прах Магдалены Радзівіл у Мінск заяўляў яшчэ ў 2016 годзе Мацей Радзівіл. Урэшце яе прах быў перавезены ў Беларусь, і новым месцам супакою на 2 гады стаў касцёл у Кухцічах. А цяпер прах

Магдалены Радзівіл з Завішаў перазахавалі ў сцяне ў левым нэфе касцёла Найсвяцейшай Тройцы (святога Роха) у Мінску.

Такім чынам, падчас экскурсіі у Кухцічы кальвінскі збор дазволіць перагартаць старонкі больш чым 400-гадовай гісторыі культуры Беларусі, адлюстраванай у такіх падтэмах экскурсійнага расказа, як «Кнігадрукаванне ў XVI ст.», «Мецэнацкая дзейнасць магнацка-шляхецкіх родаў Беларусі», «Рэлігійнае жыццё на тэрыторыі Беларусі ў XVI—XX стст.», «Палацава-паркавыя ансамблі канца XVIII – сярэдзіны XIX ст. і іх структура».

Хочацца верыць, што мы і нашы нашчадкі пабачаць не толькі 3D рэканструкцыю гэтай гістарычнай каштоўнасці – аднаго з двух будынкаў кальвінскіх збораў 16 ст. ў Беларусі. Калі Беларусь імкнецца стаць турыстычнай дзяржавай, то Уздзеншчына з яе рэлігійнай, літаратурнай і навуковай гісторыяй, пры блізкасці да сталіцы, можа стаць сапраўдным турыстычным кландайкам.

ЛІТАРАТУРА

1. Местечко Узда [Электронный ресурс] / https:www/google/com/. – Режим доступа: https://tutejszy.ru/minskaya/uzdenskij/uzda/411-mestechko-uzda. – Дата доступа: 04.02.2023.

2. Федорук, А.Т. Старинные усадьбы Минского края/ А.Т. Федорук. – Минск: Полифакт-Лекция, 2000.

3. Страчаная спадчына/ Т.В. Габрусь [і інш.]; пад аг. рэд. Т.В. Габрусь. – Мінск: Беларусь, 2003. – С. 204-205.

4. Кушнярэвіч, А.М. Культавае дойлідства Беларусі XIII–XVI стст./ А.М. Кушнярэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993.

5. Першамайск. Стары кальвінскі збор і сядзіба [Электронны рэсурс]/ https://www.google.com/. Рэжым доступа: https://bytravelling.by/pershmajsk/. – Дата доступа: 04.02.2023.

6. Багадзяж М. Я – беларуска// Беларуская мінуўшчына. – 1996, № 1.